ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 25 (820) ● Чацвер, 9 верасня 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ...

● Учарашнія школьнікі—студэнты ● Палажэнне аб аглядзе-конкурсе на лепшы факультэт па пастаноўцы НДРС ● 3 дзённіка трэцяга семестра ● Народнай Балгарыі — 27 год ● Да 50-годдзя універсітэта ● На нарачанскіх плёсах.

## ПАРАДНЁНЫЯ ВЕДЫ І ВОПЫТ

Там, дзе даводзіцца выступаць лектарэм БДУ, не бывае раўнадушных слухачоў. І тэму не рэдкасць, калі пасля лекцыі яшчэ доўга працягваецца гутарка, у час якой ідзе і абмен думкамі, і абмен скарбамі, такімі, як веды і вопыт.

Майстэрства універсітэцкіх лектараў, членаў таварыства «Веды», даўно заваявала прызнанне і добра служыць справе выхавання працоўных, прапагандзе рашэнняў партыі. Аб гэтым сведчаць і папулярнасць нашых лектараў, і шмат якія ўзнагароды. Так, нядаўна аб вопыце работы універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды» ў падшэфных раёнах расказалі сваім чытачам часопіс «Слова лектара» і брашура маскоўскіх аўтараў В. І. Нямцовай і М. М. Сіманян, якія вывучалі вопыт работы мінскай абласной арганізацыі таварыства «Веды» па прапагандзе гісторыі і палітыкі КПСС.

Прыбавіліся і новыя ўзнагароды. Ганаровымі граматамі Барысаўскага гаркома і райкома партыі адзначана універсітэцкая арганізацыя таварыства «Веды» (старшыня дац. М. Я. Рэзнікаў). Ганаровая грамата ўручана загадчыку кафедры палітэканоміі прафесару С. М. Маліміну за актыўную шэфскую работу кафедры. Граматамі ўзнагароджаны загадчык кафедры палітэканоміі гістфака В. К. Драчоў і старшы выкладчык кафедры навуковага камунізму М. П. Квочкін.

**В. АРЛОЎ.**

## МАРА ЗБЫЛАСЯ





Пачынаючы з 5-га класа Галя Чэрняк і Аля Яцкевіч займаліся ў гуртках юннатаў. Вучоныя з Мінска прысылалі ў школы Гродзенскай вобласці заданні па сортавыпрабаванню. І юныя аматары прыроды старанна вырошчвалі самыя розныя сарты агуркоў, памідораў, цукровых буракоў.

Тры гады запар Галя Чэрняк была ўдзельніцай ВДНГ у Маскве, а ў 1967 і 1968 гадах атрымала два медалі за вырошчванне агуркоў «нежынскага» сорту. Ала Яцкевіч была ўдастоена бронзавага медаля ВДНГ за атрыманне высокаўраджайнага сорту цукровых буракоў. А рэферат Наташы Давыдоўскай быў прысвечан энергетычным працэсам у арганізмах ракападобных.

Рыхтавала яго Наташа, калі вучылася ў адной з севастопальскіх школ і наведвала Інстытут біясферы паўднёвых мораў. Ёй давялося пабываць з экспедыцыяй інстытута на Фінскім заліве і Белым моры. У 1970 годзе рэферат дэманстраваўся ў Маскве, і зусім нядаўна Наташа была ўзнагароджана бронзавым медалем удзельніка ВДНГ.

У гэтым годзе споўнілася мара і Галі, і Алы, і Наташы: яны сталі студэнткамі біялагічнага факультэта БДУ.

**НА ЗДЫМКАХ:** першыя практычныя заняткі па заалогіі вядзе дацэнт Ю. С. Патаенка. З мікраскопамі працуюць Г. Чэрняк і А. Яцкевіч; (злева) Н. Давыдоўская.

**В. ЖУК.**

# ПАЛАЖЭННЕ

## АБ АГЛЯДЗЕ-КОНКУРСЕ ФАКУЛЬТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА НА ЛЕПШУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

### ЗАДАЧЫ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ

Агляд-конкурс прызван забяспечыць масавы ўдзел студэнтаў у навукова-даследчай рабоце, планамернае развіццё ўсіх форм і напрамкаў навуковай і тэхнічнай творчасці студэнтаў з улікам профілю факультэта, пошук новых форм, шырокае прыцягненне да кіраўніцтва і арганізацыі навукова-даследчай работы студэнтаў работнікаў народнай гаспадаркі і навуковых устаноў.

Агляд-конкурс павінен садзейнічаць завяршэнню стварэння на кожным факультэце такой сістэмы, пры якой кожны студэнт авалодаў бы навыкамі самастойнай творчай працы.

Агляд-конкурс павінен садзейнічаць папулярызацыі перадавога вопыту работы лепшых факультэтаў, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый і саветаў студэнцкіх навуковых таварыстваў, выяўленню, аналізу і распаўсюджанню новых эфектыўных метадаў і форм арганізацыі НДРС.

Конкурс з'яўляецца агульнаўніверсітэцкім аглядам, які ставіць мэту вызначыць лепшы факультэт па пастаноўцы і арганізацыі навуковай работы студэнтаў.

### ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ

Агляд-конкурс на лепшы факультэт універсітэта праводзіцца з 1 студзеня і па 1 студзеня наступнага года.

Для яго правядзення ствараецца аргкамітэт у складзе прадстаўнікоў рэктарата, парткома, камітэта камсамола, прафкома і студэнцкага навуковага таварыства. Аргкамітэт зацвярджаецца загадам рэктара.

Па заканчэнні агляду-конкурсу на расшыраным пасяджэнні вучонага савета універсітэта сумесна з прадстаўнікамі парткома, камітэта камсамола і прафкома аналізуюцца вынікі агляду, адзначаюцца пераможцы, зацвярджаюцца мерапрыемствы па далейшаму развіццю навукова-даследчай работы студэнтаў у кожным падраздзяленні універсітэта. Ход конкурсу павінен шырока асвятляцца ў газеце «Беларускі універсітэт» і насценных газетах факультэтаў.

Факультэты прадстаўляюць штогод да 10 студзеня матэрыялы агляду па прыкладаемай форме ў аргкамітэт агляду-конкурсу.

### УМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ

Першынство факультэтаў на лепшую арганізацыю навукова-даследчай работы студэнтаў вызначаецца:

па ліку студэнтаў, якія займаюцца навукова-даследчай работай (працуючыя над пэўнай тэмай у навукова-даследчым або прадметным гуртку, на кафедры, у лабараторыі або па гаспадарча-дагаворнай тэматыцы, удзельнічаючыя ў рабоце СНДЛ, СВЦ і інш.);

па колькасці дакладаў, зробленых студэнтамі на секцыях студэнцкіх навуковых канферэнцый БДУ і іншых ВНУ;

па колькасці студэнцкіх работ, прадстаўленых на рэспубліканскія конкурсы;

па колькасці работ студэнтаў, аднесеных да І, ІІ, ІІІ катэгорыі на рэспубліканскіх аглядах студэнцкіх навуковых прац;

*(Заканчэнне на 2-й стар.).*






*На калгасныя палі. Да сустрэчы, універсітэт!*

*Фота В. ЖУКА.*

# П А Л А Ж Э Н Н Е

## АБ АГЛЯДЗЕ-КОНКУРСЕ ФАКУЛЬТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА НА ЛЕПШУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

па колькасці студэнцкіх работ, прадстаўленых на ўсесаюзныя конкурсы;

па колькасці работ студэнтаў, адзначаных на ўсесаюзных конкурсах;

па колькасці друкаваных студэнцкіх работ на працягу года;

па колькасці экспанатаў, зробленых студэнтамі і прадстаўленых на выстаўкі;

па колькасці выкладчыкаў, якія ўдзельнічаюць у кіраўніцтве студэнцкімі навуковымі работамі;

па колькасці артыкулаў, заметак, змешчаных у газеце «Беларускі універсітэт» і колькасці выпушчаных бюлетэняў і стэндаў СНТ на факультэтах на працягу года і прысвечаных навукова-даследчай рабоце студэнтаў.

### СІСТЭМА БАЛАЎ ДЛЯ ВЫЗНАЧЭННЯ ЛЕПШАГА ФАКУЛЬТЭТА ПА АРГАНІЗАЦЫІ НДРС

1. Члены СНТ

а) якія займаюцца НДР на кафедрах (па тэмах)—50 балаў;

б) у прадметных гуртках і сістэматычна выступаюць на пасяджэннях гурткоў з дакладамі—30 балаў;

в) працуючыя па гаспадарча-дагаворнай тэматыцы на кафедры — 50 балаў;

г) працуючыя ў СНДЛ, СВЦ і іншых студэнцкіх бюро — 70 балаў.

2. Даклад на канферэнцыі БДУ і іншых вну — 50 балаў.

3. Навукова-даследчая або рэфератыўная работа, прадстаўленая на рэспубліканскі конкурс, — 100 балаў.

4. Вынікі рэспубліканскага агляду:

работа I катэгорыі — 200 балаў;

II — 100 балаў;

III — 50 балаў;

5. Навукова-даследчая работа, прадстаўленая на ўсесаюзны конкурс — 250 балаў.

6. Вынікі ўсесаюзнага конкурсу:

работа, адзначаная медалем,—600 балаў;

граматай МВ і ССА СССР або ЦК ВЛКСМ — 400 балаў;

падзякай МВ і ССА СССР або ЦК ВЛКСМ — 300 балаў.

7. За адхіленую або вернутую работу факультэт пазбаўляецца 200 балаў.

8. Экспанат, прадстаўлены на ВДНГ СССР, — 300 балаў, ВДНГ БССР — 200 балаў, рэспубліканскія выстаўкі — 150 балаў. За атрыманы залаты медаль ВДНГ СССР — 600 балаў, сярэбраны — 400 балаў, бронзавы — 300 балаў.

9. Надрукаваная праца ў навуковых часопісах або зборніках — 350 балаў.

10. Кіраўніцтва студэнцкай навуковай працай. Кожны кіраўнік — 100 балаў.

11. Кожны артыкул, надрукаваны ў газеце «Беларускі універсітэт»,—50 балаў, кожны выпушчаны бюлетэнь СНТ на факультэце — 100 балаў, кожны афармлены стэнд, які адлюстроўвае работу СНТ,—400 балаў.

Месца факультэта ў аглядзе-конкурсе ўстанаўліваецца ў залежнасці ад паказчыка N і $N_1$:

$$N = A : B$$

дзе A — агульная колькасць балаў, якія прыходзяцца на факультэт, B — лік студэнтаў, якія займаюцца на дзённым аддзяленні факультэта (на 1 студзеня справаздачнага года).

$$N_1 = C : B_1$$

дзе C — колькасць выкладчыкаў факультэта, кіруючых навуковай працай студэнтаў, $B_1$ — агульная колькасць выкладчыкаў факультэта.

### КОНКУРСНЫЯ ПРЭМІІ

I. Першая прэмія — адна.

Ганаровая грамата рэктарата, парткома, камітэта камсамола і прафкома за I месца.

II. Другая прэмія — адна.

Ганаровая грамата за II месца.

III. Трэцяя прэмія — 2.

Ганаровая грамата за III месца.

Размер прэміі ўстанаўліваецца рэктаратам сумесна з грамадскімі арганізацыямі.

**Заўвагі.** 1. Балы за ўдзел у рабоце навукова-даследчых, прадметных гурткоў, семінараў улічваюцца толькі пры наяўнасці спісачнага саставу гуртка, кіраўніка, плана работы і пры ўмове прадстаўлення персанальнай або групавой справаздачы аб здзейсненай рабоце і яе выніках на працягу года.

2. Не прымаюцца на агляд-конкурс матэрыялы курсавых і дыпломных работ.

3. Колькасць членаў СНТ, выкананыя імі работы і зробленыя даклады ўлічваюцца па таму факультэту, да якога адносіцца кафедра, дзе працуе навуковы кіраўнік.

4. Работы, апублікаваныя студэнтамі ў часопісах і зборніках, павінны быць пералічаны.

5. Матэрыялы аб факультэтах, заняўшых прызавыя месцы, публікуюцца ў газеце «Беларускі універсітэт».

# П А Л А Ж Э Н Н Е

## АБ АГЛЯДЗЕ-КОНКУРСЕ НА ЛЕПШУЮ КАФЕДРУ ПА АРГАНІЗАЦЫІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Лепшая кафедра па арганізацыі НДРС вызначаецца:

1. У залежнасці ад сумы балаў (B), набраных кафедрай.

Колькасць балаў вызначаецца па тых жа паказчыках, што і ў аглядзе-конкурсе на лепшы факультэт па арганізацыі НДРС.

2. Навукова-даследчыя работы і даклады студэнтаў адносяцца да той жа кафедры, на якой працуе навуковы кіраўнік.

3. Месца, займаемае кафедрай у аглядзе-конкурсе, устанаўліваецца ў залежнасці ад паказчыка, вызначаемага з суадносін

$$A = B : (a_1 + 1{,}5a_2 + 0{,}5a_3)$$

дзе $a_1$ — лік штатных выкладчыкаў на кафедры, кіраваўшых навуковай работай студэнтаў, $a_2$ — лік штатных выкладчыкаў, не кіраваўшых навуковай работай, $a_3$ — лік аспірантаў, інжынераў і навуковых супрацоўнікаў, кіраваўшых навуковай работай студэнтаў.

# ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСУ

(Заканчэнне. Пачатак у №№ 10, 21)

**Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР узнагародзіла дыпломамі першай ступені:**

А. Верашчагіна (хімфак). Навуковы кіраўнік—дацэнт В. В. Свірыдаў.

К. Вайтэнка (хімфак). Навуковы кіраўнік—асістэнт М. М. Бражнікаў.

Л. Салаўёву (хімфак). Навуковы кіраўнік — кандыдат хімічных навук Н. Г. Рафальскі.

Н. Казлова (хімфак). Навуковы кіраўнік — А. П. Ельніцкі.

Н. Дварнічэнка (хімфак). Навуковы кіраўнік—ст. выкладчык Г. Н. Ражноў.

Л. Чарушкіну (хімфак). Навуковы кіраўнік — асістэнт О. М. Бубель.

М. Балашэвіч (хімфак). Навуковы кіраўнік—дацэнт Л. М. Аўсянка.

С. Сцёпіна (хімфак). Навуковы кіраўнік — кандыдат хімічных навук А. І. Чартко.

С. Раманава (хімфак). Навуковы кіраўнік—дацэнт Л. М. Аўсянка.

Л. Палуботка (хімфак). Навуковы кіраўнік—кандыдат хімічных навук Л. І. Севасцьянава.

А. Браценнікава (хімфак). Навуковы кіраўнік—інжынер Л. І. Канюшка.

А. Беланові́ч (хімфак). Навуковы кіраўнік — асістэнт Л. П. Рогач.

К. Буланаву (біяфак). Навуковы кіраўнік—кандыдат біялагічных навук К. В. Фамічэнка.

Е. Германа (біяфак). Навуковы кіраўнік—М. І. Гаравец.

Д. Санько (біяфак). Навуковы кіраўнік—В. М. Чарнагузаў.

Л. Лярскую, Т. Шмаянкову (біяфак). Навуковыя кіраўнікі — прафесар Е. П. Кесарава, асістэнт Э. В. Франкоўскі.

В. Касмачова (біяфак). Навуковыя кіраўнікі—прафесар Е. П. Кесарава, асістэнт Э. В. Франкоўскі.

Е. Ключарову (біяфак). Навуковы кіраўнік—Л. В. Кахновіч.

Н. Драко (біяфак). Навуковы кіраўнік—дацэнт А. Т. Пікулеў.

А. Папок (біяфак). Навуковы кіраўнік — дацэнт Ю. С. Патаенка.

Г. Ерамееву, С. Аскерка (біяфак). Навуковы кіраўнік—Л. В. Камлюк.

І. Окунь (біяфак). Навуковы кіраўнік—кандыдат біялагічных навук С. Л. Аксенцаў.

Н. Калеснікаву (біяфак). Навуковы кіраўнік—М. М. Філімонаў.

В. Пракулевіч (біяфак). Навуковы кіраўнік — А. Ф. Былінскі.

В. Чэрнік (біяфак). Навуковы кіраўнік — дацэнт Ю. А. Бібікаў.

В. Свірыд (біяфак). Навуковы кіраўнік — дацэнт В. Д. Бібікава.

Л. Кот (філфак). Навуковы кіраўнік—дацэнт І. П. Кахно.

В. Свяжынскага (філфак). Навуковы кіраўнік — дацэнт Я. М. Камароўскі.

А. Бутэвіча (філфак). Навуковы кіраўнік — дацэнт Я. М. Камароўскі.

В. Усціновіча (філфак). Навуковы кіраўнік — І. І. Лушчыцкая.

Р. Красавіцкую (філфак). Навуковы кіраўнік — прафесар Л. І. Фіглоўская.

Т. Радзюк (філфак). Навуковы кіраўнік—кандыдат філалагічных навук Д. В. Фёдараў.

А. Разум (філфак). Навуковы кіраўнік—доктар філалагічных навук І. Я. Навуменка.

Е. Хвалей (філфак). Навуковы кіраўнік — дацэнт В. П. Рагойша.

К. Пабудзей (юрфак). Навуковы кіраўнік — доктар юрыдычных навук І. С. Цішкевіч.

Л. Міхайлоўскую (гістфак). Навуковы кіраўнік — прафесар Л. С. Абецэдарскі.



*У час летняга працоўнага семестра на рэстаўрацыйных работах у Брэсцкай крэпасці працаваў атрад студэнтаў-гісторыкаў нашага універсітэта «Рэстаўратар».*

*НА ЗДЫМКУ: фрагмент мемарыяльнага комплексу.*

Фота В. ЖУКА.

## Старонкі дзённіка

# ЗА РАКОЙ АРЭСАЙ

**«Буравеснік» — будаўнічы атрад Белдзяржуніверсітэта. Працуе на меліярацыі ў саўгасе «Арэса» ад Любанскай ПМК-17. Яго вытворчая праграма — 60 тысяч рублёў капіталаўкладанняў. Атрад адзін з лепшых у Кастрычніцкім раёне.**

— СХАДЗІ да «арыстакратаў»... Нешта «катаржнікі» затрымліваюцца...

Я спачатку не разумеў, калі чуў гэтыя словы. З усмешкай мне паведамілі, што ў атрадзе дзве асноўныя рабочыя прафесіі: калабоі і дзернарэзы.

Ідуць калабоі па калена ў вадзе, забіваюць малаткамі калы на адкосах канала. Работа хоць і патрабуе фізічнай сілы, але затое чыстая. Вось і ахрысцілі калабоеў «арыстакратамі». І зусім добра жылося б ім, калі б не авадні, якія штодня ўвіваюцца над аголенымі спінамі. Калабоі нават жартуюць, што аваднёў забіваюць за дзень больш, чым калоў. А таму і не дзіўныя словы аб методыцы работы: «Малатам—па вадзе, кулаком — па авадні».

Зусім іншая справа — дзернарэзы. У іх задачу ўваходзіць нарыхтоўка дзёрну, дастаўка яго да канала, укладка на адкосы.

Усё пачынаецца з таго, што да трактара чапляюць вельмі падобны на вялікія сані дзернарэз. На «сані» залазяць 3—4 «катаржнікі». Аказваецца, такое катанне—занятак не толькі прыемны, але і неабходны, каб дзёран рэзаўся лепш. Марудна паўзе трактар праз луг, з-пад нажа бяжыць роўная тоўстая стужка дзёрну. Рэзкімі ўзмахамі разца Ваня Горгун хутка дзеліць стужку на роўныя квадраты.

Некаторыя адносіны да «катаржнікаў» маюць і пяць дзяўчат атрада. Разам з хлопцамі яны ўкладваюць дзёран на адкосах. Укладка лягчэйшая за нарыхтоўку, аднак нікольki не чысцейшая. Але дзяўчаты трымаюцца стойка, і скупы на пахвалу камісар Міша Раманаў часта гаворыць пра іх: «Малайцы!»

У «БУРАВЕСНІКА» усё мае сваю назву. Ёсць імя і ў сталовай — кафэ «Чабарок». Нарадзілася яно не адразу. З 1 ліпеня стаў працаваць атрад, адначасова пачалося афармленне лагера. Зразумела, што першым быў аб'яўлен конкурс на лепшую назву сталовай. Аднак выбіраць з дзесяткаў прапаноў не давялося. У першы ж дзень павары пачаставалі рабят такім цудоўным чаем, завараным чабарком, што ўсе прапановы аказаліся лішнімі. Вырашылі аднагалосна: назавём наша кафэ—«Чабарок». Вытворчасць гэтага фірменнага напітку ўсё больш удасканальваецца Валяй Калітухай і Томай Пятровіч.

Ды ці адным чаем вядома кафэ! Варта зазірнуць у кнігу скарг і прапаноў.

У гарачыя працоўныя дні, каб дарэмна не траціць дарагі час, абед прывозяць прама да канала. Менш смачным ён ад гэтага не становіцца.

ГРАМАДСКІЯ даручэнні паміж байцамі «Буравесніка» былі размеркаваны яшчэ задоўга да прыезду ў Альбінск. У лектарскую групу ўвайшлі В. Савіцкі, А. Лаўшук і Т. Пятровіч, на чале агітбрыгады сталі Т. Пасюк і Т. Ярац, жыццё атрада ў насценгазеце і баявых лістках узяліся адлюстроўваць С. Карпушкін і Г. Непачаловіч.

Асабліва вялікай папулярнасцю ва ўсёй акрузе карыстаецца агітбрыгада атрада. Лекцыі і мастацкую самадзейнасць брыгады дастойна ацанілі і ў вёсках Забалоцце і Лясковічы, і, вядома, у Альбінску.

„БУРАВЕСНІК» як атрад меліяратараў існуе трэці год. Састаў атрада да працоўнага семестра-71 змяніўся амаль напалову. У касцяку па-ранейшаму «старыя»—В. Адамушка, М. Раманаў, М. Шклянік, М. Кузьміч, Г. Непачаловіч, Т. Ярац, В. Калітуха, Т. Пятровіч і многія іншыя. Іменна ў «Буравесніку» Валодзя Адамушка прайшоў шлях ад байца да камандзіра, а Міша Раманаў — да камісара.

Грыша Непачаловіч, па яго выказванню, піў ваду амаль з усіх балот Беларусі. У мінулыя гады байцы «Буравесніка» асушвалі балоты Салігорскага і Крупскага раёнаў Мінскай вобласці.

Выхаванне старэйшымі маладых пачалося з урачыстага ўручэння ветэранамі трэцяга семестра навічкам значкоў байцоў студэнцкага атрада і рабочых інструментаў.

**В. ЖУК.**

# НАРОДНАЙ БАЛГАРЫІ 27 ГОД

Сёння спаўняецца 27-я гадавіна сацыялістычнай рэвалюцыі ў Балгарыі. У шматвяковай гісторыі краіны няма больш значнай падзеі, чым перамога Дзевятага верасня 1944 года. У гэты дзень балгарскія патрыёты, згуртаваныя пад сцягам Айчыннага фронту, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі зверглі манарха-фашысцкі рэжым і ўстанавілі народную ўладу.

За мінулыя гады ў Балгарыі адбыліся глыбокія сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні. Паскоранымі тэмпамі развіваецца матэрыяльна-тэхнічная база сацыялізму. У Балгарыі ў параўнанні з даваенным перыядам у 33 разы ўзрос выпуск прамысловай прадукцыі і ў 2,5 раза — сельскагаспадарчай. Тэмпы эканамічнага развіцця Балгарыі цяпер адны з самых высокіх у свеце. Хутка развіваюцца навука і культура.

X з'езд БКП прыняў новую праграму, якая нацэліла камуністаў і ўвесь народ на хутчэйшую пабудову развітага сацыялістычнага грамадства.

Адзначаючы дзень 9 верасня, савецкія людзі ад душы жадаюць балгарскім сябрам новых вялікіх поспехаў на карысць сваёй сацыялістычнай радзімы.



Аб горадзе, універсітэце расказвае сваім новым сябрам трэцякурсніца Таня Антановіч. Фота В. ЖУКА.

## ПОБАЧ З СЯБРАМІ

У першыя дні новага навучальнага года шматтысячную студэнцкую сям'ю БДУ папоўнілі юнакі і дзяўчаты з замежных краін. Сярод іх — дзесяць студэнтаў-балгар. Яны залічаны на першы і другі курсы факультэта прыкладной матэматыкі. Адбылося знаёмства з горадам, універсітэтам, з савецкімі людзьмі. Аб сваіх першых уражаннях балгарскія студэнты расказалі нашаму карэспандэнту А. Александровіч.

Барана МАСКОЎСКА:

— Не магу выказаць свайго захаплення! За паўмесяца, якія пражыла ў Мінску, уражанняў шмат. Я нарадзілася і вырасла ў Плеўні. Мой горад называюць горадам балгара-рускай дружбы. З дзяцінства я была сведкай сапраўды сяброўскіх адносін паміж нашымі народамі. Марыла наведаць вашу цудоўную краіну. І вось цяпер я ў захапленні ад гасціннасці і прыхільнасці беларусаў.

Стаянка ЖЭЛЕВА:

— А я ўжо пабывала на рускім вяселлі. І поўнасцю згодна з Баранай, бо там я ўбачыла ўсю шырыню і адкрытасць сэрцаў вашых людзей.

Мая АНТАВА:

— Жыла і вучылася я ў Сафіі. Скончыла гімназію. Затым мне прадставілася магчымасць прадаўжаць вучобу ў Савецкім Саюзе. Цяпер я ведаю, што мне пашанцавала. Мы добра агледзелі універсітэт. Кафедры і лабараторыі з выдатным абсталяваннем, вялікая бібліятэка, прасторныя чытальныя залы—усе магчымасці для паспяховай вучобы ёсць. Жывем мы ў адным з лепшых інтэрнатаў разам з савецкімі студэнтамі. У нас шмат цікавых агульных размоў, інтарэсаў.

Панайот ДЗЕНЕЎ:

— У сябе на радзіме я многа чытаў у газетах і часопісах аб вядомых савецкіх вучоных, якія працуюць у галіне матэматыкі. Чытаў таксама аб новых вылічальных машынах «Мінск-2» і «Мінск-22». Я меркаваў, што тут будуць усе магчымасці для вучобы і практычных заняткаў, таму марыў трапіць сюды на вучобу. Універсітэт выклікаў у мяне добрыя ўражанні. Вельмі прыхільна нас сустрэлі дэкан, выкладчыкі. Асабліва мне падабаецца, як у вас чытаюць лекцыі: бавно (павольна), спакойна і самую сутнасць.

Лазарына ДЗІМІТРАВА:

— Першыя заняткі прайшлі добра. Мы пазнаёміліся з рускімі студэнтамі. Былі ў іх у гасцях. З імі мы адчуваем сябе свабодна, проста. Хачу сказаць, што мне надзвычай спадабаўся Мінск. Ён такі малады, прасторны і прыгожы. Я пабывала ўжо ў мастацкім музеі. Добрыя ўражанні ў мяне пакінулі карціны Сурыкава, Верашчагіна, Рэпіна, аб якіх я раней шмат чытала, і творы беларускіх мастакоў.

Маргарыта і Мілен ВАСІЛЕВЫ:

— Мы — маладая сям'я. Разам вучымся на другім курсе ФПМ. Больш за ўсё нам падабаюцца рускія людзі.

Ліда МІЦАВА:

— Упершыню Савецкі Саюз я наведала ў 1969 годзе. Тады я на працягу месяца працавала ў Бранскай вобласці ў складзе балгара-савецкага студэнцкага будаўнічага атрада. Дамоў вярталася з вялікай марай — яшчэ раз наведаць вашу краіну. І калі даведалася, што лепшыя нашы студэнты паедуць вучыцца ў СССР,—узрадавалася і пачала яшчэ больш займацца, каб добра здаць экзамены і прыехаць сюды. Цяпер зноў ваша цудоўная краіна гасцінна сустрэла мяне.

Юлка СІМЕОНАВА:

— Яшчэ ў малодшых класах сярэдняй школы я захаплялася матэматыкай. Марыла аб вучобе ў СССР, таму што ваша краіна адна з вядучых у гэтай галіне. Асабліва ж уразілі мяне, калі мы пераехалі граніцу, савецкія людзі. Сардэчныя, добрыя, гасцінныя. І я рада, што вялікае свята балгарскага народа мы будзем сустракаць побач з сябрамі.

Пётр МІЛАНАЎ:

— Я поўнасцю падзяляю пачуцці маіх суайчыннікаў і думаю, што ўсе мы будзем добра вучыцца, каб апраўдаць давер'е нашай і вашай краін.

Маргарыта і Мілен Васілевы ў перапынку паміж лекцыямі знаёмяцца з карататэкай чытальнай залы бібліятэкі.



*Матэрыялы старонкі падрыхтаваны універсітэцкім аддзяленнем Таварыства савецка-балгарскай дружбы.*

## ПАКОЙ ДРУЖБЫ

*Напярэдадні свята балгарскага народа на пятым паверсе галоўнага корпуса нашага універсітэта адкрыўся пакой савецка-балгарскай дружбы. Тут дэманструюцца выстаўкі, якія расказваюць аб поспехах Балгарыі ў пабудове сацыялізму, аб сяброўскіх сувязях паміж калектывамі Беларускага і Сафійскага універсітэтаў.*

*У пакоі можна пачытаць газеты і часопісы Балгарскай Народнай Рэспублікі, а неўзабаве — і кнігі: тут ствараецца бібліятэка балгарскай літаратуры.*

*М. БАРЫСАЎ.*



Першыя практычныя заняткі. Задача ў Маі Антавай не з лёгкіх. Трэба падумаць.

## ПРАКТЫКА, ЭКСКУРСІІ, АДПАЧЫНАК

**Сёлета ў чэрвені БДУ наведала першая група балгарскіх студэнтаў. На працягу трох тыдняў студэнты-хімікі Сафійскага універсітэта знаёміліся з пастаноўкай вучэбна-выхаваўчай работы на хімфаку, працавалі ў лабараторыях, пабывалі ў цікавых экскурсіях — у Інстытуце фізіка-арганічнай хіміі АН БССР, на заводзе медпрэпаратаў, дзе пазнаёміліся з тэхналогіяй атрымання антыбіётыкаў, на Полацкім хімічным камбінаце і нафтаперапрацоўчым заводзе.**

**Балгарскія сябры пазнаёміліся з выдатнымі мясцінамі сталіцы Беларусі, пабывалі ў Хатыні і на Кургане Славы, у музеі Суворава ў Кобрыне.**

**У ліпені-жніўні нашымі гасцямі былі студэнты-матэматыкі з Сафіі. Іх цікавіў наш вылічальны цэнтр і Інстытут матэматыкі АН БССР.**

**У гэтыя дні азнаямленча-вытворчую практыку ў Сафійскім універсітэце праходзяць нашы студэнты-географы пад кіраўніцтвам выкладчыцы В. П. Сіняковай. На днях з гэтай жа мэтай выязджаюць студэнты-хімікі на чале з дацэнтам А. І. Пешчанка. Акрамя практыкі, іх чакаюць цікавыя падарожжы ў Варну, Бургас, Плоўдзіў і іншыя балгарскія гарады. Студэнты сустрэнуцца з моладдзю на прадпрыемствах і ва ўстановах, пабываюць у кааператыўных гаспадарках.**

**С. БУЛЫЧОЎ,**
**начальнік аддзела замежных сувязей БДУ.**

## З ГАБРАВА—СТАЛІЦЫ СМЕХУ

*Балгарскі горад Габрава славіцца сваімі цудоўнымі тканінамі. Аднак імі не адзенеш усю планету. Яго абутковая індустрыя таксама дасягнула небывалага размаху. Але і яна не бярэцца абуць усіх. А вось жарты габраўцаў могуць рассмяшыць каго хочаш.*

*Габраўцы валодаюць пачуццём меры, ведаюць цану капейцы. Любяць пасмяяцца не толькі над іншымі, але і над сабой. І няхай іншыя падсмейваюцца над іх беражлівасцю — не бяда! Габраўцы не крыўдлівыя, усё разумеюць і ганарацца тым, што іх горад — балгарская сталіца смеху.*

*І вось некалькі анекдотаў — вясёлых пырскаў габраўскага гумару.*

### ПА-ГАБРАЎСКУ

Сустрэліся аднойчы жыхары розных раёнаў Балгарыі і, як звычайна, пачалі спрачацца, чый горад лепшы. Паколькі ніхто не хацеў уступаць, яны дамовіліся сабрацца праз некалькі дзён і прынесці тое, чым славіцца радзіма кожнага.

З Хаскова прынеслі ягня, смажанае на пожагу, з Ямбола — вараныя рубцы, з Бургаса — залiўную рыбу, з Горна-Арахавіцы — каўбасу дамашняга прыгатавання, з Талбухіна — каравай, з Плоўдзіва — садавіну, з Сафіі — смажанае кураня, з Кракова — фісташкі, з Траяна — слівавую ракію, з Асенаўграда — малагу, з Разграда — кіслае малако, а жыхар Габрава прывёў... свайго брата.

### ПІСЬМО

Габравец пытае прыяцеля:

— Іван, ты атрымаў маё апошняе пісьмо?

— Якое пісьмо? Ці не тое, у якім ты просіш пазычыць табе 100 леваў?

— Ага.

— Не, такога пісьма не атрымліваў.

### ВЫТРЫМКА

Сустрэліся дзве машыны на вузкім мосце. Шафёры-габраўцы не хацелі траціць бензін на задні ход. Адзін раскрыў газету і стаў чытаць, спадзеючыся, што другому надакучыць чакаць. Але той вылез з кабіны, сеў на капот і крыкнуў:

— Калега, калі дачытаеш, дай і мне прагледзець...

### ВЯЧЭРА

— Ты сёння свабодны?

— Ага.

— А заўтра да абеду?

— Свабодны.

— А паслязаўтра вечарам?

— Заняты, а што?

— Шкода! Хацеў запрасіць цябе на вячэру.

### УСЁ ПРАДУГЛЕДЗЕЎ

Пачуў габравец, што нейкі сафійскі ўрач амалоджвае па метаду прафесара В. старых, і вырашыў паспытаць шчасця. На вакзале касір параіў яму ўзяць білет туды і назад, таму што гэта каштуе танней.

— Дзякую, — адказаў габравец. — Калі аперацыя будзе ўдачнай, на адваротным шляху я вазьму дзіцячы білет.

### ВЯДОМЫЯ ЛЮДЗІ

Падсмейваліся над габраўцам, што, маўляў, пра яго землякоў расказваюць многа анекдотаў.

— Правільна, — адказаў ён.— Анекдоты складаюцца пра вядомых людзей.

